FAIRPLAY

SPORT FOR FAIR, EQUAL AND INCLUSIVE WORLD

# СПОРТ І ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

красавік-чэрвень 2023



# Зьмест

Уводная ........................................ 1

Што ня так з правамі чалавека
ў спорце ў Беларусі? ........................................ 3

Правы жанчын у спорце ........................................ 8

ЛГБТК+ ........................................ 14

Расізм і антысемітызм ........................................ 18

Вайна і спорт ........................................ 21

Бясьпека, абарона і абслугоўваньне
падчас спартовых мерапрыемстваў ........................................ 24

Заключэньне ........................................ 26

# Сьпіс абрэвіятур

АБФФ — Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футболу»
МАК — Міжнародны Алімпійскі камітэт
НАК — Нацыянальны Алімпійскі камітэт
FIFA — Fédération Internationale de Football Association
FIFPRO — Fédération Internationale des Associations de Footballeurs Professionnels
NBA — National Basketball Association
NCAA — National Collegiate Athletic Association
NHL — National Hockey League
NWSL — National Women's Soccer League
UEFA — Union of European Football Associations
WNBA — Women’s National Basketball Association

# Уводная

Сёньня сьвет прафэсійнага спорту зьмяняецца зь вялікай хуткасьцю. На гэта ўплываюць сацыяльна-палітычныя падзеі, што адбываюцца, зьмены ў кіраваньні міжнароднымі спартовымі арганізацыямі, а таксама вялікі попыт на зьмены ўмоваў працы з боку прафэсійных спартсмэн_ак.

У аналітыцы за красавік-чэрвень 2023 года мы прааналізавалі найбольш значныя падзеі ў спорце праз прызму міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека і спорта.

З 2020 года тэма парушэньняў правоў чалавека стала штодзённай часткай беларускага спорту — пачынаючы абмежаваньнямі права на свабоду выказваньня меркаваньня, заканчваючы ўмовамі працы і дамоўнымі гульнямі. Аднак, у 2023 годзе міжнародная спартовая супольнасьць сфакусавалась на яшчэ адной праблеме — гэта допуск альбо нядопуск беларускіх і расейскіх атлет_ак на міжнародныя спаборніцтвы, у тым ліку на Летнія Алімпійскія Гульні (АГ) ў Парыжы ў 2024 годзе.

Напярэдадні Чэмпіянату свету (ЧС) па футболе сярод жанчын у спартыўнай супольнасьці актыўна абмяркоўвалася тэма траўматызму, а пытаньні няроўнай аплаты працы ўзнімаліся ня толькі ў футбольнай супольнасьці, але таксама ў тэнісе і баскетболе. У той жа час, мы падзяліліся некаторымі прыкладамі калабарацый, якія накіраваны на пераадоленьне гендэрнай няроўнасьці.

Штогод чэрвень лічыцца «месяцам гонару», таму шматлікія спартовыя стэйкхолдэр_кі арганізуюць спэцыяльныя кампаніі, уцягваючы прафэсійных спартсмэн_ак. У дадзеным тэксьце коратка апісваецца досьвед людзей, якія працуюць у прафэсійным спорце і зрабілі камінг-аут, і як гэта паўплывае на сучасны спартовы сьвет і на іх месца ў ім.

Напрыканцы мы зьвярнулі ўвагу на тэму расізма ў спорце, які моцна адбіўся на рэпутацыі гішпаньскай La Liga і федэрацыі футбола Гішпаніі. «Справа Vinicius Junior» — адзін з самых гучных скандалаў, які адбыўся ў 2023 годзе і абмяркоўваўся на вышэйшым узроўні дзяржаваў і міжнародных арганізацыяў.

Мы таксама закранулі тэму абароны прафэсійных спартсмэн_ак у кантэксьце вайны Расеі супраць Украіны, а таксама тэму бясьпекі спартсмэн_ак і заўзятар_ак падчас спартовых мерапрыемстваў.

# Што ня так з правамі чалавека ў спорце ў Беларусі?

2 чэрвеня на сайце беларускага футбольнага клюба «Тарпеда-БелАЗ» зьявілася навіна аб тым, што на наступную гульню ягоныя гульцы выйдуць у новай форме ад нямецкіх вытворцаў Puma. У сваіх сацсетках клюб назваў Puma сваім тэхнічным партнэрам (верагодна, пост быў адрэдактаваны — паводле аўтар_ак). Нягледзячы на тое, што Puma адмаўляе сваё супрацоўніцтва з беларускімі футбольнымі клюбамі, яшчэ ў 2021 годзе брэнд пачаў пастаўляць экіпіроўку беларускаму лёгкаатлету Maksim Nedasekau, які адкрыта падтрымлівае дэ-факта ўлады ў Беларусі.

Puma, як і шмат іншых брэндаў спартовага адзеньня, заяўляе, што ў аснове іхняй стратэгіі ўстойлівага разьвіцьця і ўзаемадзеяньня з грамадзтвам тых краін, дзе Puma ажыцьцяўляе сваю дзейнасьць, ляжыць павага да правоў чалавека. Тых жа паводзінаў брэнд фармальна патрабуе ад усіх сваіх партнэраў. Аднак, нават апасродкаваная падтрымка Puma спартсмэн_ак, якія адкрыта заяўляюць аб сваёй падтрымцы дэ-факта ўладаў Беларусі і рэпрэсіяў супраць мірных грамадзян_ак, ня толькі супярэчыць узятым на сябе абавязкам па павазе правоў чалавека, але і стварае ілжывы вобраз нармальнасьці аўтарытарнага рэжыму і ягоных саюзні_ц, падрываючы этычныя і маральныя каштоўнасьці спорту.

Тым часам рэпрэсіі ў Беларусі працягваюцца. 28 чэрвеня ў Горадні быў затрыманы Dzmitry Kavalyonak, былы гулец і цяперашні спартовы дырэктар ФК «Неман». Па інфармацыі сілавікоў, Dzmitry быў затрыманы з-за скаргаў гульцоў клюба на тое, што ён навязваў «абсурдныя экстрэмісцкія ідэі». Dzmitry быў вызвалены, аднак яго прымусілі запісаць так званае «пакаяльнае відэа», у якім таксама былі апублікаваныя асабістыя ліставаньні атлета. Практыка стварэньня і распаўсюджваньня «пакаяльных відэа» недапушчальная і зьяўляецца супрацьпраўным дзеяньнем, якое парушае свабоду ад прыніжаючага чалавечую годнасьць абыходжаньня, свабоду выказваньня меркаваньня, права на неўмяшаньня ў асабістае жыцьцё.

10 красавіка беларускаму адвакату Aliaksandr Danilevich прысудзілі 10 год пазбаўленьня волі за «дапамогу ў публічных закліках да дзеяньняў, накіраваных на прычыненьне шкоды нацыянальнай бясьпецы Рэспублікі Беларусь». Кліент_камі Danilevich зьяўляліся беларускія рэпрэсаваныя спартсмэн_кі Aleksandra Herasimenia і Aliaksandr Apeikin, якія раней былі завочна асуджаныя ў Беларусі да 12 год калёніі. Па выніку Danilevich быў абвінавачаны ў тым, што ён наўмысна аказваў садзеяньне спартсмэн_кам шляхам дачы юрыдычных парадаў у галіне міжнароднага спартовага права. Падобнае абвінавачаньне фактычна крыміналізуе ўсю адвакацкую дзейнасьць у Беларусі і пазбаўляе людзей права на абарону, а саміх адвакат_ак — права на прафэсію.

З пачатку паўнамаштабнага ўварваньня Расеі ва Украіну востра стаіць пытаньне допуска расейскіх і беларускіх атлет_ак на розныя міжнародныя

спаборніцтвы. Адзінай пазыцыі на гэты конт няма і кожная спартовая асацыяцыя альбо зьвяз вырашаюць пытаньне лакальна. Так, 5 красавіка стала вядома, што выканаўчы камітэт UEFA ня будзе выключаць беларускія футбольныя каманды зь міжнародных спаборніцтваў, нягледзячы на ліст 100 эўрапейскіх парлямэнтарыяў, у якім быў падкрэсьлены ўдзел Беларусі ў агрэсіі Расеі супраць Украіны і ўнутрыпалітычныя рэпрэсіі супраць уласных грамадзян_ак. Адсутнасьць рэакцыі UEFA і наступстваў для беларускага футболу зьяўляецца па сутнасьці прыкладам sportwashing і можа быць выкарыстаным уладамі як доказ сваёй легітымнасьці і прызнаньня міжнароднай супольнасьцю.

У той жа час, Міжнародная федэрацыя хакея на лёдзе (IIHF) яшчэ раз ацаніла магчымасьць допуска зборных Беларусі і Расеі да спаборніцтваў і пацьвердзіла, што пакуль такое дзеяньне не зьяўляецца бясьпечным. Застаецца невядомым лёс беларускіх атлет_ак на Алімпійскіх Гульнях-2024 у Парыжы, ці будуць яны дапушчаныя як нацыянальная зборная, альбо пад нэўтральным сьцягам. 23 сакавіка зьявілася інтэрвію зь беларускім велагоншчыкам Yauheni Karaliok, які падтрымаў беларускія дэ-факта ўлады і рэпрэсіі ў краіне, аб тым, як ён ставіцца да магчымага выступленьня ў нэўтральным статусе. Па меркаваньні спартсмэна, усе атлеты павінны выступаць у аднолькавых умовах, то бок у складзе нацыянальнай каманды, прадстаўляючы краіну на міжнароднай арэне. Лідэры краін «Вялікай сямёркі» (G7) таксама заклікаюць не дапушчаць спартсмэн_ак зь Беларусі і Расеі пад сьцягамі сваіх дзяржаваў, падкрэсліваючы такім чынам уплыў расейскай агрэсіі на міжнародны спорт.

Акрамя адназначных забаронаў міжнародных спартовых асацыяцыяў, беларускія спартсмэн_кі таксама могуць падпасьці пад асабістыя санкцыі ў розных краінах. З 29 траўня Польшча ўвяла санкцыі супраць шэрагу беларускіх грамадзян_ак, у тым ліку мінімум 24 беларускіх атлет_ак, якія зьвязаныя зь беларускімі уладамі, прымаюць удзел у прапагадзе альбо садзейнічаюць рэпрэсіям у Беларусі. Гэта азначае, што спартсмэн_кі ня змогуць заязджаць на тэрыторыю Польшчы і ўдзельнічаць там у спаборніцтвах. Калі той жа пазыцыі пачнуць прытрымліваецца і іншыя краіны, гэта будзе азначаць паралізацыю беларускага прафэсійнага спорту, у прыватнасьці тых атлет_ак, якія падтрымалі де-факта ўлады Беларусі.

Patricia Lamanna — канадзкая футбалістка, якая на працягу трох месяцаў гуляла ў ФК «Менск» і была названая «трансфэрнай бомбай», у сваіх сацсетках падзялілася, што пакідае клюб. Футбалістка плянавала гуляць у клюбе год, аднак, прыняла рашэньне сыйсьці значна раней. Магчыма, на прыняцьце такога рашэньня паўплывалі ўмовы працы ў беларускім спорце: першапачаткова спартсмэнка жыла на базе клюба, аднак пазьней яе папрасілі зняць сабе кватэру, за свае ўласныя сродкі, пры тым, што

банкаўскія карткі Lamanna на тэрыторыі Беларусі не працавалі з-за санкцыяў, а яе заробак у памеры 900 беларускіх рублёў (~290 эўра) плацілі не цалкам. Футбалістка таксама падзялілася, што перад гульнёй з «Бабруйчанкай», у якой яна забіла 4 мячы, ёй не давалі ежу цэлы дзень і яна «ледзь не страціла прытомнасьць». Досьвед Patricia паказвае, што беларускі футбол не гатовы да такіх трансфэраў, а ўмовы працы для гул_інь у цэлым далёкія ад міжнародных стандартаў у частцы справядлівых і спрыяльных умоваў працы.

11 траўня 2023 года на сайце АБФФ зьявілася інфармацыя аб тым, што Камітэтам па кантрольна-дысцыплінарных і па этычных пытаньнях АБФФ было прынятае рашэньне аб прымяненьні дысцыпліярных спагнаньняў у дачыненьні да ФК «Шахцёр», ФК «РЦОР-БДУ» і ФК «Белшына» за правядзеньне дагаворных гульняў: штрафы, пазбаўленьне ачкоў на сэзоны 2023 і 2024 гадоў, пазбаўленьне атрыманых узнагародаў у чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па футболе 2022 года сярод каманд Вышэйшай лігі; пэрсанальныя дысцыплінарныя пакараньні шэрага футбалістаў і прадстаўні_ц адміністратыўнага/трэнерскага штаба клюбаў.

У сюжэце АТН, які выйшаў у чэрвені і жніўні 2023, неаднаразова гаворыцца аб тым, што асаблівасьцю дадзеных дагаварных гульняў зьяўляецца тое, што ў іх арганізацыі прымалі ўдзел трэція асобы. Аднак, на 22 студзеня 2023 года Vladimir Niederhaus, названы ў сюжэтах АТН «трэцяй асобай, якая не уваходзіць у кіраўніцтва клюба» ФК «Шахцёр», зьяўляўся намеснікам дырэктара клюба па спартовай працы. У адным зь сюжэтаў намесьніка старшыні Упраўленьня Сьледчага Камітэта Беларусі распавёў аб фактах стымуляваньня футбалістаў ФК «Дынама-Брэст», што паслужыла падставай для прыцягненьня да дысцыплінарнага спагнаньня з боку АБФФ у дачыненьні да футбаліста клюба Mikhail Gordeychuk. У гэтай сувязі непасьлядоўным выглядае адсутнасьць рэакцыі з боку АБФФ на паказаньні футбаліста Віцебска, які заявіў, што футбалісты атрымалі ўзнагароджаньне ад прадстаўніка Шахцёра, аднак вырашылі ня браць грошы, а накіраваць іх на дабрачыннасьць. Пры гэтым, ні адзін з гульцоў/прадстаўні_ц ФК «Віцебск» да гэтага моманту ня быў прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасьці.

Наступствы прававога дэфолту ў дзяржаве ня могуць абыйсьці бокам і сфэру футбола: адсутнасьць у Беларусі незалежнага прафсаюзу футбаліст_ак; выбарачны падыход да выбару асобаў, якія падвяргаюцца дысцыплінарным спагнаньням, як з боку мясцовай федэрацыі, так і з боку судоў; выкарыстоўваньне санкцыйных інструмэнтаў толькі да трэціх асоб і адсутнасьць крытычнага падыхода да сябе з боку АБФФ. Дадзеныя абставіны ня толькі падрываюць давер да сыстэмы арганізацыі і правядзеньня спартовых спаборніцтваў у Беларусі, але і ставяць пад пагрозу гарантыі абароны правоў і свабод удзельні_ц індустрыі.

У той жа час беларускі футбол цалкам залежыць ад дзяржаўнага фінансаваньня і падтрымкі. Такая залежнасьць аказвае свой негатыўны ўплыў на аўтаномію і кіраваньне спортам. Чарговым прыкладам стала прызначэньне на пасаду старшыні футбольнага клюба «Днепр-Магілеў» экс-супрацоўніка пракуратуры Siarhei Kapytov. У сваім інтэрвію прэс-службе клюба Kapytov падзяліўся, што ён «сюды не збіраўся», хоць запрашалі яго «і 10 год таму, і 5 год таму», а сваю сувязь з футболам экс-пракурор апісаў так: «Я хоць і гуляў у баскетбол, але на ўсе футбольныя гульні хадзіў». Дзяржаўны ўплыў на прыняцьце рашэньняў, зьвязаных з прызначэньнем футбольных чыноўнікаў і мэнэджэраў, выклікае асьцярогі наконт празрыстасьці і справядлівасьці сыстэмы беларускага футболу.

У праграме «Навіны 24 гадзіны» на СТБ паведамілі аб мінулым таварыскім матчы па футболе паміж парлямэнтарыямі і «камандай з абмежаванымі магчымасьцямі». Гэта магла б быць навіна аб прыкладзе інклюзіі ў беларускім спорце, але па факце мы бачым ужываньне некарэктнай і дыскрымінацыйнай лексікі. Фармулёўка «інвалід» зьяўляецца некарэктнай, таму што тут цалкам адсутнічае падыход “people-first language” — мова, арыентаваная на людзей у першую чаргу. Выраз «чалавек з абмежаванымі магчымасьцямі» зьяўляецца некарэктным і дыскрымінацыйным, таму што стварае пэўны стэрэатып вакол чалавека (нараўне зь «непаўнацэнн_ая»), да якога сам_а чалавек можа сабе ўвогуле не адносіць. Інваліднасьць — ня толькі медыцынскі, але і сацыяльны панятак, а асаблівасьць чалавека не вызначае яго/яе/іх асобу, таму мы рэкамендуем выкарыстоўваць фармулёўку «чалавек з інваліднасьцю». Пагатоў такім уплывовым на грамадзкую думку інстытуцыям як дзяржаўнае тэлебачаньне.

Апошнія падзеі ў сьвеце беларускага спорту паказваюць, што аўтарытарныя дэ-факта ўлады Беларусі абіраюць выкарыстоўваць свой уплыў і кантроль над спартовай сфэрай, маніпуляваць спортам і спартовымі мерапрыемствамі, грэбаваць правамі чалавека, замест таго, каб падтрымліваць прынцыпы сумленнай канкурэнцыі, павагі правоў і свабод чалавека, спартовага духу і сумленнай гульні. Аналізуемыя парушэньні падкрэсьліваюць неабходнасьць прыцягненьня да адказнасьці людзей, якія займаюць кіруючыя пазыцыі ў краіне і ўсіх датычных асобаў у адпаведнасьці зь міжнароднымі стандартамі ў гэтай галіне. Сытуацыя ў Беларусі служыць напамінам аб важнасьці захаваньня прынцыпаў правоў чалавека ва ўсіх сфэрах жыцьця грамадзтва, уключаючы спорт, і аб неабходнасьці калектыўных намаганьняў дзеля забесьпячэньня павагі асноўных правоў і свабодаў чалавека.

# Правы жанчын у спорце

У сьвеце жаночага спорту адзначаецца негатыўная тэндэнцыя ў частцы права на здароўе. Адным з такіх прыкладаў зьяўляецца высокі ўзровень сьмяротнасьці сярод жанчын ў перадрадавы і радавы перыяды, а ў ЗША — цёмнаскурыя жанчыны паміраюць часьцей за сьветласкурых.

Амэрыканская лёгкаатлетка, алімпійская чэмпіёнка Tori Bowie памерла ад ускладненьняў пры родах. Апытаньне Каліфарнійскага унівэрсітэта паказвае, што мэдыцынскія супрацоўні_цы часта не прыслухоўваюцца да перавагаў жанчын, у прыватнасьці цёмнаскурых, у дачыненьні да родаў. Ігнараваньне меркаваньняў цяжарных жанчын павышае рызыку сьмяротнасьці і ўскладненьняў для маці і іх дзяцей. Сукамандніцы Bowie выказаліся пасьля яе сьмерці, адзначыўшы праблему, зьвязаную са стэрэатыпамі ў дачыненьні да цёмнаскурых жанчын у грамадзтве, у прыватнасьці — у мэдыцынскай супольнасьці. Гэта яшчэ больш пагаршае існуючую няроўнасьць і парушае асноўныя правы чалавека — права на здароўе і права на жыцьцё.

З палохаючай частасьцю футбалісткі сутыкаюцца з адной з самых цяжкіх для спартсмэн_ак траўмаў — траўмай пярэдняя крыжаватыя вязы (ПКВ). Капітанка зборнай Ангеліі, гуліня FC Arsenal, Leah Williamson прапускае Чэмпіянат сьвету па футболе сярод жанчын 2023 года з-за траўмы ПКВ. Williamson апублікавала кранальны пост у сваім Instagram. Пры гэтым яна зьяўляецца трэцяй футбалісткай, якая атрымала траўму ПКВ у FC Arsenal за апошнія паўгады. З той жа праблемай сутыкнуліся футбалісткі Beth Mead і Vivianne Miedema. За апошнія два гады траўму таксама атрымалі яшчэ пяць футбалістак — усе яны ня змогуць удзельнічаць у турніры. Millie Bright пасьпела аднавіцца да пачатку ЧС і заняла месца Leah Williamson у якасьці капітанкі зборнай Ангеліі, аднак раней яна сутыкнулася з той жа праблемай.

Па статыстыцы, спартсмэнкі сутыкаюцца з разрывам крыжаватых вязаў ў 2-8 разоў часьцей за іхніх калегаў-мужчын; паводле дасьледаваньня 1 з 19 футбалістак разрывае ПКВ. Сярод фактараў, якія ўплываюць на павышаную рызыку, называюць фізіялягічныя адрозьненьні паміж мужчынамі і жанчынамі, умовы асяродзьдзя, гарманальныя ўсплёскі падчас мэнструяльнага цыклу жанчын, генэтыку і біямэханіку. дасьледаваньні па гэтай тэме існуюць ужо каля 20 год, аднак праблема застаецца актуальнай. дасьледаваньні могуць паказаць саму сутнасьць і статыстыку, але не даюць рашэньня. У некаторай ступені адбываецца нармалізацыя гэтай траўмы сярод жанчын, што абсалютна нядапушчальна і ставіць пад пагрозу здароўе, эмацыйны стан і кар’еры спартсмэн_ак. Траўма ПКВ зьяўляецца складанай з пункту гледжаньня дасягненьняў і формы — спартсмэн_кам рэдка ўдаецца аднавіцца да таго ж узроўня гульні, які быў да траўмы.

FIFA разпрацавалі праграму прафіляктыкі траўматызму “The FIFA 11+”

(як для жанчын, так і для мужчын), якая ўключае ў сябе дынамічную разьмінку для спартсмэн_ак. Аднак шмат спартсмэн_ак грэбуюць гэтай прафіляктычнай праграмай з-за адсутнасьці часу ці доступу да рэсурсаў на сацыяльна-эканамічным і гендарным узроўнях. FIFPRO правялі дасьледаваньне, у якім прынялі ўдзел 362 футбалісткі, удзельніцы кантынентальных чэмпіянатаў, па выніках якога 54% зь іх не прайшлі перадтурнірнае абследаваньне, 70% не зрабілі ЭКГ перад турнірам, і толькі 40% змаглі назваць сябе прафэсійнымі футбалісткамі. Эканамічны аспект праблемы заключаецца яшчэ ў дарагоўлі апэрацыяў — ва ўжо пазначаным артыкуле часопісу Orthopedics and Orthopedic Surgery кошт апэрацыяў у 2021 годзе «можа перавышаць 650 мільёнаў даляраў у год». Пры гэтым праблема нізкага ўзроўня інвэстыцыяў у жаночы футбол застаецца актуальнай. Таксама варта надаваць увагу кваліфікацыі мэдыцынскага пэрсанала, якасьці абсталяваньня і суадносінам дапаможнага пэрсанала і гул_інь.

Відавочна, што дасьледаваньні траўматызму жанчын у спорце неабходна праводзіць ня толькі на ўзроўні біямэханікі, але і ў частцы якаснай інфраструктуры і інвэстыцыяў у жаночы спорт. Гэта сур’ёзная і комплексная праблема, якая закранае пытаньні парушэньня правоў чалавека на здароўе, права на працу (бясьпечныя і роўныя ўмовы працы) і абарону ад дыскрымінацыі.

Эўрапейская асацыяцыя клюбаў правяла апытаньне сярод 350 жанчын-гулінь з 16 вядучых эўрапейскіх клюбаў. 82% апытаных адчуваюць пастаянны дыскамфорт пры нашэньні футбольных бутс, а пятая частка індывідуалізуе абутак, выкарыстоўваючы спэцыяльныя вусцілкі альбо выразаючы адтуліны ў пятцы, каб пазьбегнуць пухіроў. Рынак абутку пабудаваны на падыходзе ўнісэкс, але ў першую чаргу арыентаваны на белых мужчын. Дасьледаваньняў, якія б паказалі прамую залежнасьць паміж не спэцыяльна падабраным абуткам і колькасьцю траўмаў ПКВ няма, аднак, па меркаваньні Katrine Kryger, дацэнткі Унівэрсітэта Сьвятой Марыі ў Лёндане, гульні ў жаночым футболе часьцей праводзяцца на палях нізкай якасьці, а выкарыстаньне абутку, не прызначанага для гульні альбо не падыходзячага фізіялагічна, павышаюць рызыку атрыманьня траўмы.

У сваю чаргу Nike прадставілі мадэль бутс, якія былі разпрацаваныя спэцыяльна для жанчын. У кампаніі выдаткавалі больш за два гады на дасьледаваньне, тэставаньне і праэктаваньне такога абутку, прыслухоўваючыся да меркаваньня жанчын-гулінь. Досьвед Nike павінен стаць прыкладам для іншых спартовых брэндаў у частцы недыскрымінацыі і комплекснага падыхода да запытаў і патрэбаў спартсмэн_ак.

FIFA ўпершыню ў гэтым годзе прадаюць правы на правядзеньне

мужчынскага і жаночага Чэмпіянату сьвету па футболе асобна. Аднак, Прэзідэнт FIFA Gianni Infantino выказаўся адносна непрымальных прапановаў на медыя-правы на турнір сярод жанчын у пяці буйных эўрапейскіх краінах і прыгразіў забараніць трансьляцыю чэмпіянату. Пазьней у сваім Instagram Infantino дадаў, што прагляды ЧС сярод жанчын складаюць 50-60% ад мужчынскага, а прапановы вяшчальных кампаній у краінах «вялікай пяцёркі» для жаночага турніра ў 20-100 разоў ніжэй, і гэта зьяўляецца «аплявухай усім вялікім удзельніцам Чэмпіянату сьвету па футболе і ўвогуле ўсім жанчынам сьвету». Нагадаем, у гэтым годзе прызавы фонд Чэмпіянату сьвету па футболе сярод жанчын складае 150 мільёнаў даляраў, што ў 3 разы вышэй паказчыку 2019 года і ў 10 разоў — 2015 года, аднак гэтая сума ўсё яшчэ значна ніжэй агульнай сумы прызавых для мужчынскага чэмпіянату — 440 мільёнаў даляраў.

У траўні 2023 года пачаўся Адкрыты чэмпіянат Італіі па тэнісе. На працягу першых дзён чэмпіяната востра паўстала пытаньне аб няроўнай аплаце працы мужчын і жанчын: чэмпіён турніру атрымлівае 1,2 мільёна даляраў, у той час як чэмпіёнка — 567 215 даляраў; агульны бюджэт для усіх гульцоў-мужчын складае 8,3 мільёна даляраў, а для жанчын — 3,88 мільёна даляраў.

Абодва прэцэдэнты сьведчаць аб парушэньні права чалавека на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы, у прыватнасьці справядлівы заробак і роўную ўзнагароду за працу роўнай вартасьці; жанчынам павінны гарантавацца ўмовы працы ня горшыя за тыя, якімі карыстаюцца мужчыны, з роўнай аплатай за роўную працу.

Вышэйшы адміністрацыйны суд Францыі падтрымаў забарону Фрацузкай федэрацыі футбола на нашэньне хіджабаў падчас футбольных гульняў. Суд вынес сваё рашэньне пасьля таго, як футбалісткі з “Les Hijabeuses” правялі кампанію супраць забароны і падалі ў суд на федэрацыю. Такая забарона не адпавядае рэкамендацыям FIFA, якія афіцыяльна дазволілі нашэньне галаўных убораў па рэлігійных прычынах падчас футбольных гульняў яшчэ ў 2014 годзе (пункт 4 Правілаў гульні). У дадзеным выпадку мае месца парушэньне правоў чалавека на абарону ад дыскрымінацыі, а таксама ушчамленьне свабоды мусульман_ак выказваць свае меркаваньні і перакананьні.

У апошні час паміж WNBA і NCAA разлютаваліся спрэчкі датычна NIL-здзелак (Name, Image and Likeness — тэрмін, датычны ужываньня імя, вобразу і падабенства спартсмэн_ак каледжаў у маркетынгавых і рэклямных мерапрыемствах, з дапамогай якіх яны могуць атрымліваць фінансавую ўзнагароду). Дзякуючы NIL-здзелкам гуліні каледжаў могуць зарабляць больш, чым прафэсійныя гуліні WNBA, з-за чаго некаторыя спартсмэнкі не сьпяшаюцца пераходзіць у статус прафэсійных гулінь WNBA. У сваю чаргу Breanna Stewart, прафэсійная амэрыканская

баскетбалістка, бачыць прычыну гэтых спрэчак у больш глябальных праблемах — жаночы спорт асьвятляецца ў СМІ меньш, чым на 5%, і спартсмэнкі не павінны змагацца адна з адной за гэтыя 5%, яны павінны атрымліваць «50 альбо 100, альбо колькі заўгодна адсоткаў», павінны патрабаваць больш ад СМІ і кампаніяў з пункту гледжаньня маркетынгу. (Ня)бачнасьць жаночага спорту ў медыя-прасторы застаецца актуальнай і вельмі вострай праблемай, цесна пераплятаючыся з праблемамі роўнай аплаты, роўнага доступу і інвеставаньня ў жаночы спорт.

Аналізуемы пэрыяд адзначыўся партнэрскімі рухамі рознага роду з мэтай прасоўваньня жаночага футбола. Spotify разам з London City Lionesses і She Plays Football аб'ядналіся, каб даць магчымасьць новаму пакаленьню дзяўчын займацца футболам. Мэта праэкта — «павелічэньне разнастайнасьці нізавых каманд і прадастаўленьне ўнікальных магчымасьцяў для дзяўчын, якія імкнуцца гуляць у футбол». Для 600 дзяўчын з усяго Барнэта, аднаго з 32 боро Лёндана, была прадстаўлена магчымасьць атрыманьня бясплатных штодзённых 1,5-гадзінных трэніровак па футболе. Праводзіліся трэніроўкі прафэсійнымі трэнерка_мі, і гуліні London City Lionesses дзейнічалі ў якасьці спэцыяльных гасьцей з мэтай матываваньня дзяўчын на заняткі футболам. Кампанія таксама супрацоўнічае зь мясцовымі школамі і дапамагае вызначыць, дзе ў грамадзтве дзяўчынам больш за ўсё не хапае магчымасьці займацца спортам. У сваю чаргу пасьля адкрытага ліста “Lionesses” (яго падпісалі ўсе 23 гуліні) урады Вялікай Брытаніі абвесьціла, што мае намер прадаставіць ўсім школьні_цам роўны доступ да футболу. Пакуль роўны доступ да спорту ўсе шчэ застаецца праблемай, такія ініцыятывы неабходныя для павышэньня інклюзіі і роўнасьці.

Яшчэ адзін цікавы прыклад: кампанія Nike абвесьцілі пра заключэньне трохгадовага пагадненьня з Liga BBVA MX Femenil (вышэйшы дывізіён жаночага футболу ў Мэксыцы) і сталі эксклюзыўнымі спартовымі партнэрамі лігі. У Nike ужо быў падобны досьвед партнэрства з NWSL. Кампанія будзе падтрымліваць жаночы футбол у Мэксыцы «як на полі, так і за ягонымі межамі», праз прадастаўленьне мэксыканскім футбалісткам інавацыйных прадуктаў, інвэставаньня ў праграмы развіцьця для новага пакаленьня, прадастаўленьня мячэй. Nike ужо даўно працуюць з мэтай разьвіцьця жаночага футболу ў краінах Эўропы і Паўночнай Амерыкі, аднак інвэставаньне такога кшталту, як Liga BBVA MX Femenil, дазваляе мэксыканскаму жаночаму футболу канкураваць з эўрапейскім і стварае для гэтага глябальную плятформу. Сваім прыкладам Nike паказваюць, як можна падтрымліваць спартсмэн_ак, дапамагаючы пашыраць магчымасьці для іх удзелу ў спаборніцтвах.

Нягледзячы на тое, што за апошнія гады, і за аналізуемы пэрыяд у прыватнасьці, можна адзначыць пазытыўныя тэндэнцыі ў аспэкце правоў жанчын у спорце, па-ранейшаму існуюць такія праблемы, як нароўная

аплата працы і нізкі ўзровень даступнасьці спорту для дзяўчын і жанчын, нізкі узровень інвэстыцыяў і мэдыцынскіх дасьледаваньняў і, як следзтва, высокі ўзровень траўматызму.

Шлях да забесьпячэньня роўных правоў для жанчын у спорце — гэта комплексны і бесперапынны працэс, які зьяўляецца часткай больш шырокай барацьбы за гендарную роўнасьць у грамадстве. Усім зацікаўленым і ўключаным краінам неабходна працягваць сваю працу з мэтай падвышэньня доўгатэрміновых зьменаў. Прасоўваючы каштоўнасьці гендарнай роўнасьці і падтрымліваючы патэнцыял дзяўчын і жанчын у спорце, мы садзейнічаем стварэньню інклюзіўнага асяродзьдзя як на полі, так і за ягонымі межамі.

# ЛГБТК+

Нягледзячы на важныя перавагі, якія дае спорт, як паляпшэньне фізычнага і мэнтальнага здароўя, умацаваньне ўпэўненасьці, зьніжэньне трывогі і стрэсу, ён па-ранейшаму застаецца недаступным і часта небясьпечным для людзей з ЛГБТК+ супольнасьцяў. Да таго часу, пакуль усе галіны спорту не стануць бясьпечнымі і спрыяльнымі для ўсіх без выключэньня, існуе патрэба ў пастаяннай адукацыі, палітычных праграмах, прававым рэгуляваньні і публічных акцыях, якія будуць накіраваныя на дасягненьне роўнасьці і бясьпекі ў спорце. Чэрвень — Месяц Гонару (Pride Month), прысвечаны гонару ЛГБТК+ супольнасьці і рухаў за правы ЛГБТК+ людзей. Гэта час, калі да праблемаў ЛГБТК+ супольнасьці, у тым ліку ў сфэры спорту, прыцягваецца максімальная колькасьць увагі. І час, калі трэба казаць і аб дасягненьнях і посьпехах прафэсійных атлет_ак, якія зьяўляюцца прадстаўніцамі ЛГБТК+ супольнасьцяў, і аб тым, што ўжо зроблена для падтрымкі ЛГБТК+ у спорце.

Адзін з самых пасьпяховых трэнераў у Жаночай нацыянальнай баскетбольнай асацыяцыі (WNBA), які двойчы атрымаў тытул трэнера года WNBA (2017, 2021), Curt Miller — адзіны адкрыты гей галоўны трэнер на самым высокім узроўні ў баскетболе. Miller яшчэ з канца 90х гадоў не хаваў сваёй арыентацыі, калі пачаў кар'еру трэнера ў студэнцкім баскетболе. У нядаўнім інтэрвію Miller адзначыў, што доўгі час ён не хацеў, каб яго ведалі толькі як «трэнера-гея». Аднак зараз ён падкрэслівае, што ўсё яшчэ застаецца адзіным адкрытым геем трэнерам на высокім узроўні ў мужчынскім і жаночым баскетболе і ягоная бачнасьць стала яшчэ больш важнай для падтрымкі іншых трэнераў-геяў. Па словах Miller, вялікая колькасьць трэнераў-геяў хаваюць сваю ідэнтычнасьць і арыентацыю, таму што баяцца не рушыць наперад у спорце і прафэсіі.

«Я хачу быць прыкладам для пераймальня для наступных пакаленьняў трэнераў-геяў, якія зараз задаюцца пытаньнем, ці змогуць яны дасягнуць сваёй мары. Я хачу, каб яны ведалі, што яны, безумоўна, могуць».

Яшчэ адзін адкрыты гей у вялікім спорце, футбаліст Гістарычна чорных вышэйшых навучальных установаў ЗША (HBCU), Byron Perkins, у сваім інтэрвію распавёў, чым было прадыктавана ягонае рашэньне публічна зрабіць камінг-аўт. Perkins спадзяецца, што ягоная адкрытасьць і адвага натхніць новае пакаленьне ЛГБТК+ атлет_ак прыняць сваю сапраўдную ідэнтычнасьць і з гонарам і ўпэўненасьцю ісьці да сваёй мары ў вялікім спорце. Perkins адзначыў, што ягоныя адносіны з таварышамі па клюбе не асабліва зьмяніліся з моманту ягонай заявы і ён адчуваў пастаянную падтрымку. Пры гэтым, Perkins не прысьпешвае іншых ЛГБТК+ спартсмэн_ак заяўляць аб сваёй арыентацыі, падкрэсліваючы, што кожн_ая сам_а вырашае, калі адпаведны момант, і такая заява не павінна ставіць пад пагрозу жыцьцё або сродкі да існаваньня спартсмэн_ак. Jason Collins, першы спартсмэн у вышэйшай прафэсійнай лізе, які адкрыта зрабіў камінг-аўт у 2013 годзе, распавёў аб сваім досьведзе ў вялікім

спорце на працягу апошніх 10 год. NBA падтрымалі свайго гульца, і чакалася, што гэта натхніць іншых атлет_ак заявіць аб сваёй сэксуальнай арыентацыі. Аднак, на працягу 10 год толькі адзін гулец у вышэйшай прафэсійнай лізе, Carl Nassib, зрабіў падобную заяву. Collins падзяліўся, што па негалосным правіле гомасэксуальнасьць не абмяркоўвалася ў распранальнях, а культура зносінаў была таксічна-маскуліннай. Большасьць жартаў і выразаў, якія выкарыстоўваліся для прыніжэньня іншых у спартовым сьвеце, былі або сэксісцкімі, або гамафобнымі. Некаторыя гульцы наўпрост заяўлялі аб сваім непрыманьні калег-геяў. Заява Collins выклікала неадназначную рэакцыю сярод спартсмэн_ак і фанат_ак, аднак ён рады, што стаў сімвалам асьветы ў сфэры прафэсійнага спорту. Collins адзначыў, што ЛГБТК+ рух у спорце ўзначальваюць жанчыны, якія больш адкрыта гавораць аб сваёй арыентацыі і аўтэнтычнасьці, аднак трэба, каб і мужчыны-спартсмэны зрабілі крок наперад, не баючыся публічнага асуджэньня.

Нягледзячы на тое, што WNBA на першых этапах свайго існаваньня прытрымліваліся стратэгіі паказваць спартсмэнак жаноцкімі і сямейнымі, з цягам часу стала самай сацыяльна адказнай і актыўнай прафэсійнай лігай, адкрыта падтрымліваючы ЛГБТК+ рух у спорце. Эвалюцыя палітыкі WNBA у стаўленьні да спартсмэн_ак і фанат_ак не была простай і пачалася з публічных заяваў саміх спортсмен_ак пра сваю сэксуальнасць. Хаця баскетбалістка Sue Wicks ня лічыць сябе першапраходцай, менавіта ейная адвага і першы камінг-аўт у WNBA праклалі шлях, па якім зараз ідуць іншыя спартсмэнкі. WNBA стала першай прафэсійнай лігай, якая запусціла цэлую маркетынгавую кампанію, арыентаваную на ЛГБТК+ супольнасьць. WNBA імкнецца падтрымаць сваіх атлетак і на пэрсанальным узроўні, як у гісторыі небінарнай атлеткі Layshia Clarendon, якая стала галоўным голасам Рады сацыяльнай справядлівасьці WNBA/WNBPA. Галоўнымі прыярытэтамі Рады зьяўляюцца абарона правоў ЛГБТК+ людзей, а таксама забесьпячэньне роўнасьці ў адносінах да аховы здароўя і грамадзянская актыўнасць.

Варта адзначыць, што пэрыядычна WNBA спрабуе фэмінізаваць сваіх спартсмэнак, напрыклад, прапаноўваючы больш жаноцкую і сэксуальную форму і зацьвярджаючы тым самым старыя сэксісцкія стэрэатыпы. Аднак сёньня ўсё больш спартсмэнак знаходзяць у сабе сілы не маўчаць і змагацца за сваю ідэнтычнасць і раўнапраўе.

Нягледзячы на рост прыняцьця і падтрымкі ЛГБТК+ супольнасці ў вялікім спорце, парушэньні правоў ЛГБТК+ людзей і адсутнасьць бясьпечнай прасторы застаюцца сыстэмнай праблемай. Гамафобія ў спорце праяўляецца нават на сымбалічным узроўні, як, напрыклад, адмова некаторых каманд ці асобных гульцоў NHL ад выкарыстаньня вясёлкавых цішошак/швэдараў у падтрымку ЛГБТК+ супольнасьці падчас разьмінак перад спэцыяльнымі гульнямі.

NHL падтрымліваюць адмовы і настойваюць на тым, што спрэчкі вакол такіх жэстаў падтрымкі адцягваюць увагу ад сутнасьці гульні. Падобнае рашэньне NHL адкочвае назад працу над тым, каб зрабіць распранальні, залі і гульнявыя арэны больш бясьпечнымі, разнастайнымі і інклюзіўнымі для ўсіх гул_інь і фанат_ак, і паказвае, што каштоўнасьці спартовых ліг і асацыяцыяў усё яшчэ трактуюцца па-рознаму, а праваабарончы патэнцыял спорту вельмі недаацэнены.

# Расізм і антысемітызм

Праблема расізму ў спорце і ў прыватнасьці футболе ўсё яшчэ застаецца актуальнай. Падчас гульні паміж València CF і Real Madrid CF 21 траўня 2023 года гулец мадрыдскага клюба Vinícius Júnior падвергся расістоўскім абразам з трыбун. Гулец спрабаваў зьвярнуць на гэта ўвагу галоўнага судзьдзі, аднак гэта не прынесла выніку і ў адным з сутыкненьняў Vinícius ударыў па твары гульца València CF, за што атрымаў чырвоную картку і быў выдалены з поля. Пасьля гульні Vinícius выказаўся ў сваім Instagram з крытыкай La Liga.

Першапачаткова прэзідэнт La Liga Javier Tebas адмаўляў якую-небудзь віну, аднак пазьней прынес свае прабачэньні, паралельна з тым, як 6 арбітр_ак, якія працавалі на матчы, былі звольненыя, правапарушальні_цы — затрыманыя, былі ўведзеныя санкцыі ў памеры 45 000 эўра, трыбуны для València CF былі зачыненыя на 5 гульняў (FC Valencia часткова выйграла апеляцыю аб зніжэньні штрафу да 27 000 эўра, а тэрмін закрыцьця стадыёна быў зменены з 5 гульняў на 3.), La Liga правялі акцыю супраць расізму, а чырвоная картка Vinícius была адмененая. Гулец таксама атрымаў падтрымку з боку FIFA, FIFPRO, прэзідэнта Бразіліі, Вярхоўнага камісара па правах чалавека ААН і шматлікіх футбаліст_ак з усяго сьвету.

Таксама футбольныя федэрацыі Бразіліі і Гішпаніі запусцілі антырасістоўскую кампанію Uma só pele (“One skin”), у рамках якой каманда Бразіліі ўпершыню за 109 гадоў надзела цалкам чорную форму падчас таварыскага матчу з Гвінеяй. Бразільская канфедэрацыя футболу таксама прасоўвала кампанію Com o racismo não tem jogo (“No playing with racism”), а ейны кіраўнік выступіў за больш актыўныя дзеяньні футбольных уладаў па супрацьдзеяньні расізму ў футболе.

Кожн_ай павінна быць забясьпечана права займацца спортам без дыскрымінацыі, у бясьпечных умовах і з павагай чалавечай годнасьці. Паводзіны чыноўні_ц у спорце паказваюць, што ў спорце ўсё яшчэ ёсьць месца расізму, мове нянавісьці і дыскрымінацыі.

Тэнісістка Sloane Stephens, якая займае 30-е месца ў сусьветным рэйтынге, пасьля сваёй перамогі ў першым раўндзе Адкрытага чэмпіянату Францыі заявіла, што сутыкаецца з расізмам на працягу ўсёй сваёй кар'еры і сытуацыя становіцца толькі горш, асабліва онлайн. Спартсмэнка адзначыла, што ў наладах ейнага Instagram-акаўнта стаіць блакіроўка на ключавыя забароненыя словы, але «гэта не перашкаджае камусьці проста ўпісаць зорачку ці надрукаваць слова па-іншаму». Па той жа прычыне спартсмэнка ня верыць у эфектыўнасьць праграмнага забесьпячэньня, якое ёсьць у гул_інь на Адкрытым чэмпіянаце Францыі і прызначана для блакіроўкі расістоўскіх камэнтароў у сацыяльных сетках, хоць і не выкарыстоўвала яго. Распрацоўні_цы жа сцьвярджаюць, што ПЗ працуе па іншых прынцыпах і сапраўды можа абараніць атлет_ак ад аб'юзу ў сеціве.

Італьянская футбольная асацыяцыя і чальцы ўрада Італіі падпісалі пагадненьне, згодна зь якім гул_іням будзе забаронена насіць футбольны нумар 88 [№88 — гэта лічбавы код для абазначэння выраза “Heil Hitler”] у рамках барацьбы з антысэмітызмам у футболе. У сакавіку гэтага года ў сацыяльных сетках зьявілася фатаграфія заўзятара SS Lazio ў футболцы з нумарам 88 і імём “Hitlerson” пасьля таго, як матч Lazio-Roma скончыўся зь лікам 1:0; двое іншых заўзятараў выканалі рымскае прывітаньне; як вынік — усе трое атрымалі пажыцьцёвую забарону на наведваньне гульняў SS Lazio. Пагадненьне таксама дае магчымасьць спыняць футбольныя матчы ў выпадках праяўленьня якіх-небудзь сымбаляў нянавісьці або антысэміцкіх дзеяньняў, а таксама ўключае ў сябе дабаўленьне этычнага кодэкса ў адпаведнасьці з Міжнародным альянсам памяці ахвяраў Галакоста. Міністр унутраных справаў Італіі Matteo Piantedosi заявіў, што гэтыя крокі зьяўляюцца «адказам на невыносныя забабоны, якія занадта часта ўзьнікаюць на нашых стадыёнах».

Расізм у спорце — даўняя і складаная праблема, якая закранае спартсмэн_ак, заўзятар_ак і спартовую супольнасьць у цэлым. Праблема праяўляецца ў розных формах у розных відах спорту і рэгіёнах і, на жаль, застаецца прадметам шматлікіх дыскусіяў. Барацьба з расізмам у спорце патрабуе ўзаемадзеяньня як мага большай колькасьці актар_ак, спартсмэн_ак, спартовых арганізацыяў, заўзятар_ак, інвэстар_ак, усяго грамадзтва. Прызнаньне праблемы, прыняцьце неабходных захадаў на лякальных і міжнародным узроўнях, фармаваньне культуры павагі і інклюзіўнасьці дапамогуць дамагчыся пазытыўных зьменаў, каб ад спорту маглі атрымліваць асалоду ўсе людзі, незалежна ад іх расавай або этнічнай прыналежнасьці.

# Вайна і спорт

У аналізаваны пэрыяд на вайне Расеі супраць Украіны пры розных абставінах загінулі прынамсі 8 украінскіх спартсмэнаў: Oleksandr Dykyi, Mykola Yaremchuk, Oleksandr Khmil, Bohdan Khodakovsky, Mykola Zhidkov, Igor Osmak, Viacheslav Savytskyi, Kyrylo Molokov.

У пачатку траўня 2022 года ва Украіне запусцілі сайт «Янголи спорту» з інфармацыяй аб загінуўшых на вайне атлет_ках і трэнер_ках. На момант напісаньня гэтай аналітыкі на сайце ёсьць інфармацыя аб 254 загінуўшых прадстаўні_цах спартовай індустрыі з пачатку поўнамаштабнага ўварваньня. У Міжнародны дзень спорту, 6 красавіка 2023 года, у Кіеве ўшанавалі памяць загінуўшых спартсмэн_ак, правёўшы акцыю «Янголи спорту: рік пам'яті».

Прэзідэнт Украіны Volodymyr Zelensky падтрымаў ініцыятыву футбалістаў Andriy Shevchenko і Oleksandr Zinchenko ў правядзеньні дабрачыннага матча ў Лёндане на стадыёне Стэмфард Брыдж. Мэтай гульні зьяўляецца збор сродкаў для рэканструкцыі ліцэя імя Кацюбінскага ў Чэрнігіўскай вобласьці.

У разьдзеле «Што ня так з правамі чалавека ў Беларусі?» мы ўжо прыводзілі прыклады абмежаваньня ўдзелу беларускіх атлет_ак у міжнародных спаборніцтвах.

Таксама ў траўні ў Таліне прайшла канфэрэнцыя “Athletes for Peace and Freedom”, якая стала «бяспрэцэдэнтнай міжнароднай спартовай плятформай, якая дае прадстаўні_цам прафэсійнага спорту магчымасьць сабрацца і абмеркаваць, як спартсмэн_кі і сучасны спорт могуць выкарыстоўваць свой патэнцыял для прасоўваньня ідэалаў міру і свабоды». У тым ліку на канфэрэнцыі абмяркоўвалася месца расейскага і беларускага спорту на міжнароднай арэне. У рамках канфэрэнцыі была прынятая дэклярацыя, у якой у прыватнасьці гаворыцца, што:

- МАК неабходна прыняць «ўсебаковыя захады», каб прадухіліць «выкарыстаньне спорту для прапаганды вайны і ваенных злачынстваў»;
- расейскія і беларускія спартсмэн_кі павінны падпісаць антываенныя дакументы і не павінны карыстацца фінансаваньнем сваіх урадаў;
- пагаджаючыся з МАК, расейскія і беларускія спартсмэн_кі, зьвязаныя з вайскоўцамі, ня могуць удзельнічаць у спаборніцтвах, а тыя, хто прайшлі допуск, могуць удзельнічаць у нэўтральным статусе;
- МАК неабходна прызнаць сытуацыю ва Украіне «вайной», а не «канфліктам».

«Няма такога паняцця «бежан_кі» — цытата дэпутата Дзярждумы Расеі, у мінулым савецкага і расейскага хакеіста, Vyacheslav Fetisov. У сярэдзіне чэрвеня зьявілася інфармацыя аб рашэньні МАК адносна крытэраў допуску расейскіх спартсмэн_ак на Алімпійскія гульні-2024. За аснову прынятыя ўмовы фармаваньня каманды бежан_ак, гэта значыць расейскія спартсмэн_кі змогуць выступаць у нэўтральным статусе; заяўкі на ўдзел падаюцца асабіста спартсмэн_камі, без пасярэдніцтва НАК; пасля зацьвярджэньня заяўкі МАК спартсмэн_кі павінны адмовіцца ад удзелу ў нацыянальных спаборніцтвах і перастаць атрымліваць падтрымку ад расейскіх спартовых арганізацыяў; будзе распрацаваная экіпіроўка для нэўтральных спартсмэн_ак. Fetisov у адказ на навіну дадаў: «Хто яны бежан_кі такія? Чаму яны маюць права сёньня не па спартовым прынцыпе, а проста па нейкім азначэньні прымаць удзел? Тут у гэтым сэнсе правы спорту нівэлююцца». Тым часам АГ-2024 стануць трэцімі, у якіх прыме ўдзел the Refugee Olympic Team. «Гэты ўнікальны праект дэманструе імкненьне МАК быць на баку бежан_ак і аказваць ім падтрымку ў спорце, як на элітным, так і на нізавым узроўні. Мэта праэкта — ня толькі дапамагчы атлет_кам-бежан_кам трэніравацца з мэтай патрапіць на Алімпійскія гульні, але і працягнуць сваю спартовую кар'еру і пабудаваць сваю будучыню. Гэтыя спартсмэн_кі таксама зьяўляюцца сімвалам надзеі для ўсіх бежан_ак ва ўсім сьвеце, паказваючы, што з дапамогай спорту можна дасягнуць шмат чаго» – гаворыцца на сайце МАК.

Чыноўні_цы Беларусі і Расеі пастаянна заяўляюць аб тым, што лічаць непрымальным ніякі іншы ўдзел у міжнародных спаборніцтвах спартсмэн_ак са сваіх краін, акрамя як пад дзяржаўнымі сьцягамі і з выкананьнем дзяржаўнага гімна. Любыя намаганьні, якія прадпрымаюцца прадстаўні_цамі міжнародных спартовых арганізацый, накіраваныя на пошук кампрамісных варыянтаў удзелу спартсмэн_ак у стартах, крытыкуюцца дэ-факта ўладамі Беларусі і ўладамі Расеі.

МАК не ў стане забяспечыць умовы для спыненьня ваенных дзеянняў, аднак яны валодаюць ўсім неабходным функцыяналам для вызначэньня канкрэтных і празрыстых крытэраў для допуску спартсмэн_ак зь Беларусі і Расеі да спаборніцтваў, неадпаведнасьць якім выключыць для атлет_ак магчымасьць удзел ў стартах. Актыўнае ўзаемадзеяньне МАК як зь міжнароднымі федэрацыямі, так і з прадстаўні_цамі грамадзянскай супольнасьці дапаможа арганізацыі даць аб'ектыўную ацэнку дзеяньняў/статусаў удзельні_ц, якія прэтэндуюць на ўдзел у Алімпіядзе 2024 як бліжэйшым глябальным спартовым івэнце.

# Бясьпека, абарона і абслугоўваньне падчас спартовых мерапрыемстваў

Перад фіналам Лігі канфэрэнцыяў Эўропы ў Празе адбылося сутыкненьне заўзятар_ак FC West Ham і FC Fiorentina — людзі кідалі крэслы ў адзін аднаго ў бары Прагі. Падчас сутыкненьня пацярпелі мінімум 3 чалавекі, паліцыя затрымала больш за 30 чалавек.

4 траўня 2023 года FC Napoli ўпершыню з 1990 года, калі за клюб гуляў Diego Maradona, і 3 раз у сваёй гісторыі сталі чэмпіёнамі Сэрыі А пасьля таго, як згулялі ўнічыю 1:1 з FC Udinese. Аднак шматтысячнае сьвяткаваньне было азмрочана трагічнымі падзеямі. Падчас сьвяткаваньня перамогі ў выніку агнястрэльных раненьняў у шпіталі памёр 26-гадовы мужчына. 3 чалавекі таксама атрымалі агнястрэльныя раненьні. Па дадзеных газеты La Stampa, яшчэ каля 200 чалавек былі шпіталізаваныя з рознымі траўмамі — ад нажавых раненьняў да апёкаў ад феерверкаў. Пры гэтым, прэфект Неапаля паведаміў толькі аб 7 шпіталізаваных людзях.

Апісаныя інцыдэнты зьяўляюцца прыкладамі парушэньня правоў чалавека на жыцьцё, здароўе, свабоды сходаў і асацыяцый, інцыдэнты таксама падпадаюць пад дзеяньне Канвэнцыі Сен-Дэні. Канвэнцыя была падпісаная Радай Эўропы ў 2016 годзе і ўсталёўвае адзіны падыход да бясьпекі, абароны і абслугоўваньня падчас футбольных матчаў і іншых спартовых мерапрыемстваў. Гэтыя захады ўзаемазьвязаныя і павінны быць збалансаваныя. Канвэнцыя ў прыватнасьці закранае такія пытаньні, як бясьпека людзей да і пасьля матчаў, ня толькі на стадыёнах, але і за іх межамі; ацэнка рызыкаў; супрацоўніцтва паліцыі і іншых кампетэнтных арганізацыяў; якасьць прыёму і стаўленьне да заўзятар_ак; усталяваньне санкцыяў за парушэньні. Дзяржаўныя ўлады і арганізатар_кі спартовых мерапрыемстваў павінны ўлічваць палажэньні Канвэнцыі пры правядзеньні гульняў і іншых спартовых мерапрыемстваў для зніжэньня ўзроўню гвалту і павышэньня бясьпекі людзей.

# Заключэньне

Паўсюдныя парушэньні правоў чалавека спартсмэн_ак і іншых удзельні_ц спартовай індустрыі ў Беларусі і адсутнасць адэкватнай рэакцыі на гэтыя парушэньні прыводзяць да таго, што індустрыя пазбаўляецца як прафэсійных кадраў (арышты, звальненьні, вымушаная эміграцыя ў іншыя краіны, адсутнасць трансфэраў замежных спартсмэн_ак), так і якіх-небудзь перспэктываў разьвіцьця. Спорт у Беларусі цалкам кантралюецца аўтарытарнымі дэ-факта ўладамі, што не пакідае месца разнастайнасьці, адзінству і справядлівасьці, павазе правоў чалавека.

Аб тэме жаночага здароўя ў прафэсійным спорце зноў загаварылі пасьля навінаў аб сьмерці алімпійскай чэмпіёнкі Tori Bowie і траўмах футбалістак FC Arsenal. На жаль, такія падзеі адбываюцца з-за недастатковай увагі да тэмы жаночага здароўя, гендарнай дыскрымінацыі ў спорце, нізкага ўзроўня мэдыцынскіх дасьледаваньняў і ігнараваньня фізіялягічных патрэбаў жанчын у спорце.

Традыцыйны Месяц Гонару — чэрвень — становіцца часам, калі спартсмэн_кі асабліва актыўна выказваюцца на тэму прыняцьця і адстойваньня сваёй ідэнтычнасьці. Аднак, неадназначная рэакцыя на выказваньні спартсмэн_ак і арганізацыя акцыяў у падтрымку прадстаўні_ц ЛГБТК+ супольнасьці нагадваюць нам аб важнасьці нефармальнай адукацыі, распрацоўкі падтрымліваючых палітычных праграмаў і забеспячэньня роўнасьці і бясьпекі ўсіх удзельні_ц індустрыі незалежна ад іх гендара і сэксуальнай арыентацыі.

Грамадзкі рэзананс вакол справы Vinícius паказаў, што сумесныя дзеяньні розных актар_ак (спартсмэн_ак, заўзятар_ак, арганізатар_ак спартовых мерапрыемстваў, спонсар_ак), накіраваныя на рашэньне праблемы расізму ў спорце, могуць быць эфектыўнымі.

Маючыя адбыцца Алімпійскія гульні ў Парыжы ў 2024 годзе стануць першым мегаспартыўным мерапрыемствам, пры правядзеньні якога давядзецца выпрацаваць дакладныя крытэры адбору спартсмэн_ак на старты, якія засноўваюцца ня толькі на спартовым прынцыпе, але і ўлічваюць палітычную сытуацыю ў сьвеце. Акрамя таго, нядаўнія сутыкненьні фанатаў падчас футбольных матчаў у Чэхіі і Італіі актуалізуюць неабходнасьць дакладнага захаваньня Канвэнцыі Сен-Дэні, якая ўсталёўвае адзіны падыход да бясьпекі, абароны і абслугоўваньня падчас футбольных матчаў і іншых спартовых мерапрыемстваў.

**FairPlay** — гэта праваабарончая арганізацыя ў/праз/для спорту.

**Наша місія**: пашырэньне магчымасьцяў для людзей у рэалізацыі спартовых правоў і правоў чалавека для роўнай, інклюзіўнай і справядлівай Беларусі і сьвету.

**Наша мэта**: у спартовай індустрыі паважаюцца правы чалавека.

Каб дасягнуць нашай місіі, мы:
— **Аналізуем** палітыкі, законы і практыкі і дзелімся імі зразумелай і даступнай мовай;
— Займаемся **адвакацыяй** на нацыянальным і міжнародным узроўнях;
— Займаемся **адукацыяй** і асьветай, у тым ліку праз спартовыя мерапрыемствы.

Тэкст падрыхтаваны сумесна калектывам аўтар_ак.

E-mail: sport@humanconstanta.org

Telegram | Facebook | Instagram